# У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў пачаўся прыём дакументаў

12.07.2024 Аўтар: Даніїл Хмяльніцкі Фота: Кацярына Урбан

**Сёння пачалася падача дакументаў ва ўстановы вышэйшай адукацыі. У сувязі з гэтым ВНУ Беларусі масава адчынілі свае дзверы для абітурыентаў. Зараз тут сапраўдная «дзвіжуха». Учорашнія школьнікі, іх родныя, блізкія і сябры запоўнілі сцены вышэйшых навучальных устаноў. Абітурыенты, натуральна, вельмі хвалююцца. Яшчэ больш перажываюць іх бацькі. Яно і зразумела — для жадаючых паступіць у ВНУ настаў час зрабіць лёсавызначальнае рашэнне. Пра тое, які ажыятаж адбываецца цяпер у вядучым творчым інстытуце краіны карэспандэнтам «Звязды» распавяла рэктар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў Наталля Карчэўская.**




Рэктар БДУКМ Наталля Карчэўская

**— Наталля Уладзіміраўна, сёння стартавала падача дакументаў у ВНУ. У сценах БДУКМ сапраўды шмат абітурыентаў. Як вы можаце ахарактарызаваць такі старт?**

— За пару гадзін працы мы назіраем велізарную колькасць абітурыентаў нашага ўніверсітэта, гэта сапраўды масавы ажыятаж, што не можа не радаваць. Варта адзначыць, што гэта працяг уступнай кампаніі. Да нас ужо залічаны абітурыенты, якія паступалі па мэтавых дагаворах. Зараз праводзіцца прыём дакументаў на агульных падставах і, вядома, вельмі прыемна, што колькасць жадаючых вучыцца ў нас значна вырасла. Яшчэ за паўгадзіны да пачатку прыёму дакументаў каля дзвярэй універсітэта выстраілася цэлая чарга! Традыцыйна першым дзесяці абітурыентам падарылі сувеніры. Наперадзе ж яшчэ некалькі прадуктыўных дзён, таму спадзяемся, што ўсё будзе добра. Дарэчы, падаваць дакументы можна і ў выхадныя дні. Тэрміны з 12 па 17 ліпеня, з 9.00 да 18.00 працуе прыёмная камісія. Ёсць людзі, якія прыязджаюць з іншых гарадоў. Шмат каму зручней прыехаць да нас менавіта ў выхадны дзень.




**— Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў моцна адрозніваецца ад іншых вышэйшых навучальных устаноў. Акрамя ЦТ і ЦЭ жадаючыя паступіць на творчыя спецыяльнасці здаюць і ўнутраны ўступны экзамен. Што ён з сябе ўяўляе?**

— На кожны напрамак спецыяльнасці прадугледжаны экзамен «Творчасць». Зразумела, што калі абітурыент паступае на спецыяльнасць «Дэкарацыя дэкаратыўна-прыкладных вырабаў», то будуць іншыя экзамены, чым на «Харэаграфічным мастацтве». Папярэдне на працягу 2023/2024 навучальнага года ў нас актыўна ішла прафарыентацыйная кампанія. За гэты час было праведзена больш за 20 Дзён адчыненых дзвярэй, а выязныя прафарыентацыйныя мерапрыемствы вылічаюцца дзясяткамі і сотнямі. Да будучых абітурыентаў мы паспяхова даводзілі асаблівасці нашай прыёмнай кампаніі.

**Што такое экзамен «Творчасць»?** Давайце разбярэмся на прыкладзе. На спецыяльнасці «Харэаграфічнае мастацтва» творчы экзамен складаецца з трох этапаў: абітурыенту неабходна выканаць, паказаць свае веды па класічным танцы, па сцэнічным конкурсным танцы і па кампазіцыі пастаноўкі танца. Для тых, хто займаецца харэаграфіяй, гэта не новая інфармацыя. «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» — гэта ж малюнак, жывапіс і кампазіцыя. У рэжысёраў тэатралізаваных паказаў альбо рэжысуры тэатра часцей за ўсё першы экзамен — майстэрства акцёра, а другі — сама рэжысура.
Такім чынам, на кожную спецыяльнасць распрацоўваецца свая індывідуальная праграма. І нашы абітурыенты добра ведаюць яе. На працягу года жадаючыя маглі атрымаць індывідуальныя кансультацыі. Многія моманты агучваліся на Днях адчыненых дзвярэй. Акрамя гэтага, на базе нашай установы арганізоўваюцца падрыхтоўчыя курсы. Дарэчы, самая актыўная частка работы падрыхтоўчага аддзялення праводзіцца зараз, на працягу двух тыдняў перад уступнымі экзаменамі. Часта на падрыхтоўчыя курсы прыходзяць не толькі абітурыенты, якія будуць паступаць сёлета, але і тыя, каму яшчэ год трэба будзе вучыцца ў школе. Акрамя таго, у канікулярны перыяд мы даем інтэрнат на час падрыхтоўкі. На нашы курсы, як правіла, прыходзяць добра матываваныя абітурыенты, якія загадзя плануюць свае будучае паступленне.



**— Як і ў любой ВНУ краіны, да вас часта прыязджаюць вучыцца іншагароднія. Як вырашаецце пытанне з жыллём?**

— У цэлым, інтэрнат мы выдаем на час вучобы, праходжання ўступных экзаменаў і, традыцыйна, усім іншагароднім студэнтам першага курса. Далей ужо сочым за дасягненнямі студэнтаў у вучэбнай, творчай, навуковай, грамадскай дзейнасці. Канешне, існуе невялікая чарга на інтэрнат, аднак амаль усім іншагароднім ён прадастаўляецца. Дарэчы, мэтавікі ў абавязковым парадку забяспечваюцца ім.

**— Ці павялічылася колькасць жадаючых паступіць у ваш універсітэт або казаць пра гэта пакуль яшчэ рана?**

— Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў праводзіць падрыхтоўку спецыялістаў за кошт сродкаў рэспубліканскага бюджэту. Невялікая колькасць месцаў вылучаецца на атрыманне вышэйшай адукацыі за кошт уласных сродкаў. Казаць жа аб павелічэнні або памяншэнні колькасці заяў пакуль яшчэ рана. Прайшло ўсяго пару гадзін з пачатку прыёму дакументаў. Усё пакажа выніковы дзень. Аднак візуальна людзей стала значна больш. У нас заўсёды быў дастаткова высокі конкурс, але каб на «Фатаграфаванне» стаяла такая вялікая чарга... У апошні раз я такое бачыла ў тыя часы, калі сама сюды паступала...

Дарэчы, сёлета павялічылі колькасць бюджэтных месцаў, а колькасць платных месцаў некалькі зменшылася. У першую чаргу мы зацікаўлены падрыхтаваць спецыялістаў для галіны культуры. А паколькі ёсць заяўкі ад арганізацый-заказчыкаў кадраў, нашы выпускнікі запатрабаваныя. Гэта агульная тэндэнцыя, і найперш мы павінны думаць пра эканоміку.

**— Наколькі ж запатрабаваныя вашы спецыялісты? Куды прыходзяць працаваць выпускнікі БДУКМ?**

— Нашы спецыялісты па напрамках сапраўды запатрабаваныя. Пасля заканчэння вучобы выпускнікі трапляюць у вядучыя ўстановы культуры. У першую чаргу задавальняюцца заяўкі арганізацый, з якімі ў нас заключаны дагаворы, а іх у нас сапраўды шмат. Кожны год папаўняецца база заказчыкаў. Сёння няма такой установы культуры, у якой не працуюць нашы выпускнікі. У гэтым годзе мы размяркоўвалі іх у Нацыянальны мастацкі музей, Нацыянальны гістарычны музей, музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.




Таксама вялікую колькасць людзей размеркавалі ў Нацыянальную бібліятэку Беларусі, Прэзідэнцкую бібліятэку Рэспублікі Беларусь, Рэспубліканскую навукова-тэхнічную бібліятэку, Дзяржаўны акадэмічны ансамбль танца, Рэспубліканскі тэатр беларускай драматургіі, Новы драматычны тэатр, Маладзёжны тэатр эстрады і іншыя. Многія адправіліся на адпрацоўку па размеркаванні ў распараджэнні ўпраўленняў культуры альбо ў аддзелы культуры і ідэалогіі па справах моладзі. Тых, хто паспяхова вучыўся, хто ўключаны ў банк даных таленавітай або адоранай моладзі, размяркоўвалі ў вядучыя ўстановы культуры.

Вядома, частка людзей засталася і ў нас. Гэта свайго роду стратэгія апошніх гадоў. Лепшыя выпускнікі размяркоўваюцца ў інтарэсах універсітэта, таму што прафесарска-выкладчыцкі склад таксама павінен абнаўляцца. Гэтая тэндэнцыя захоўваецца. Дарэчы, ужо прайшлі ўступныя экзамены ў магістратуру. У аспірантуру ж уступныя экзамены пройдуць восенню. У магістратуру быў досыць прыстойны конкурс — практычна два чалавекі на месца. Мы разумеем, што гэта нашы будучыя выкладчыкі, таму зацікаўлены ў падрыхтоўцы лепшых.

Дарэчы, сёлета размеркаванню падлягала каля 250 чалавек. Плюс да гэтага паспяхова размеркаваліся і платнікі. Сёння колькасць заявак ад арганізацый перавышае колькасць выпускнікоў, таму, калі чалавек сканчае ўніверсітэт на платнай аснове, мы даем магчымасць размеркаваць і яго. Гэта досыць распаўсюджаная практыка ў многіх ВНУ краіны. У гэтым годзе мы адпраўлялі платнікаў у Нацыянальную бібліятэку, тэлекампанію СТВ і іншыя вядучыя ўстановы.

**— Якія сёння тэрміны навучання? І ці ёсць магчымасць вучыцца на скарочанай форме?**

— Асноўны тэрмін навучання — чатыры гады. На спецыяльнасці «Дэкаратыўна-прыкладное мастацтва» прадугледжана магчымасць падрыхтоўкі студэнта па скарочанай форме атрымання вышэйшай адукацыі — гэта ўсяго тры гады. Туды трапляюць людзі, якія вучыліся па інтэграванай праграме, скончылі адпаведны каледж. Ёсць скарочаная форма і на завочцы. Яна прадастаўляецца для такіх жа выпускнікоў каледжа. Таксама сёння ў адпаведнасці з даручэннем кіраўніка дзяржавы прапрацоўваецца магчымасць скарачэння і па іншых спецыяльнасцях.

## Сапраўдныя ўражанні

Пасля шчырай размовы з рэктарам універсітэта мы спусціліся на першы паверх. Там па-ранейшаму сапраўдны аншлаг! Хтосьці перажывае, хтосьці досыць упэўнены ў сабе. Даведаліся, з якім настроем абітурыенты БДУКМ прыйшлі падаваць дакументы.



«Усё саваё жыццё я звязвала з творчасцю, — адзначыла абітурыент БДУКМ Лізавета Манько. — У пэўны момант зразумела, што хачу стаць сапраўднай актрысай. Аднак крыху пазней я трансфармавалася: вырашыла, што рэжысура тэатра — вось гэта дакладна маё! Таму і хачу паступіць на адпаведную спецыяльнасць».



Абітурыент БДУКМ Лізавета Манько

Лізавета скончыла дзяржаўную ўстанову адукацыі «Гімназія № 2 г.Бабруйска» і займалася ў тэатральным калектыве. «Я ўдзельнічала ў такіх пастаноўках, як «Паўлінка» — была ў галоўнай ролі, «Пэпі Доўгічулок», «Чароўная лямпа Аладзіна» і многіх іншых. Напэўна, хвалявання пры падачы дакументаў цяпер ужо няма, але думаю, на ўступных іспытах яно яшчэ будзе. Але я веру ў сябе, таму з усім спраўлюся. Я здала ЦТ па гісторыі Беларусі на 95 балаў, па рускай мове — на 81», — падсумавала яна.
Наступны наш суразмоўца — абітурыент БДУКМ Кірыл Барадзько. Ён скончыў дзяржаўную ўстанову адукацыі «Сярэдняя школа № 8 г.Жодзіна». Малады чалавек падзяліўся сваімі перажываннямі: «Хачу паступіць сюды на спецыяльнасць «Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)», бо люблю гэты кірунак, у будучыні планую звязаць з ім сваё жыццё. Вядома, перажываю, але спадзяюся, што ўсё будзе добра».



Абітурыент БДУКМ Кірыл Барадзько
Дарэчы, Кірыл скончыў сярэднюю школу з залатым медалём і сярэднім балам атэстата 9,8. Рускую мову малады чалавек напісаў на 98 балаў, гісторыю Беларусі — на 89, Грамадазнаўства — на 95.

«У Беларускім дзяржаўным універсітэце культуры і мастацтваў вучыцца шмат маіх знаёмых. Пасля іх апавяданняў пра вучобу цікавасць жаданне паступіць сюды яшчэ больш узрастае. Да таго ж я ведаю не так шмат вышэйшых навучальных устаноў, дзе можна навучацца на харэаграфічнае мастацтва. У будучыні хачу стаць харэографам, але таксама і выступаць у якасці артыста».

Абітурыент БДУКМ Соф’я Макаранка ўпэўненая ў сабе, прыйшла падаваць дакументы ў баявым настроі. Сёлета дзяўчына скончыла Мінскі дзяржаўны каледж мастацтваў. «Я ўдзельнічала ў Рэспубліканскім конкурсе харэаграфічнага мастацтва «Dance кангрэс — 2024» і атрымала дыплом лаўрэата трэцяй ступені ў катэгорыі «Дуэт». Дзякуючы гэтаму я магу паступіць без уступных экзаменаў. Такая магчымасць вельмі моцна дапамагае абітурыентам з паступленнем. І я вельмі рада і задаволена, што ў мяне атрымалася дасягнуць такіх добрых вынікаў. Буду паступаць сюды на «Харэаграфічнае мастацтва (эстрадны танец)». З гэтым аддзяленнем я бачусь даволі часта. Мы нярэдка працуем разам на дзяржаўных пляцоўках і конкурсах, таму выбар упаў менавіта на Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», — падагульніла яна.


Абітурыент БДУКМ Соф'я Макаранка